ЭКАДОМ

# ГАДАВАЯ СПРАВАЗДАЧА

2022

# ЗМЕСТ


03 УВОДЗІНЫ

04 ХТО МЫ І ШТО МЫ РОБІМ

08 ПРАВАВАЯ СЛУЖБА І МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

13 УСТОЙЛІВАЯ ЭНЕРГЕТЫКА І АНТЫЯДЗЕРНАЯ КАМПАНІЯ

15 ВЫРАШЭННЕ ЭКАЛАГІЧНЫХ ПРАБЛЕМ У БЕЛАРУСІ

18 UWEC: ЭКАЛАГІЧНЫЯ НАСТУПСТВЫ ВАЙНЫ ВА УКРАІНЕ

20 ЗЯЛЁНАЯ БЕЛАРУСЬ: РАСПРАЦОЎКА «ЗЯЛЁНАГА» БАЧАННЯ БУДУЧЫНІ БЕЛАРУСІ

22 ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ТЭМЫ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

24 ШТО НАПЕРАДЗЕ?



# УВОДЗІНЫ

**Уводзіны да нашай справаздачы за папярэдні, 2021 год пачыналіся са сказа: «Гэты год быў няпростым». Не хочацца паўтарацца, але што ж зрабіць! На шчасце, паўтараецца не толькі складаная частка жыцця, але і тое, што Экадом працягвае працу, нягледзячы ні на што.**

- нягледзячы на тое, што ў гэтым годзе КДБ Беларусі вырашыў аб'явіць нас «экстрэмісцкім фармаваннем» за адстойванне правоў беларусаў ды беларусак на здаровае навакольнае асяроддзе;
- нягледзячы на тое, што Беларусь выйшла з Орхускай канвенцыі, пакінуўшы беларусаў больш безабароннымі ў рэалізацыі сваіх экалагічных правоў;
- нягледзячы на тое, што ўжо цэлы год ідзе вайна, у якую наша краіна ўцягнутая насуперак волі яе жыхароў;
- нягледзячы на тое, што беларуская экалагічная суполка раскідана па ўсім свеце ў палітычнай эміграцыі, і нам даводзіцца працаваць з розных краінаў і часавых паясоў;
- і шмат чаго іншага.

Гэта абставіны, да якіх мы вымушаны адаптавацца і ў якіх мы працягваем рабіць усё, што можам. Якія ж вынікі працы Экадома былі ў гэтым годзе? Наступныя старонкі раскажуць табе пра гэта.



# ХТО МЫ І ШТО МЫ РОБІМ

## ХТО МЫ

Да жніўня 2021 года Экадом з'яўляўся юрыдычнай асобай у Беларусі. Мы былі заснаваныя ў 1996 годзе для прасоўвання экалагічна прыязнага ладу жыцця і ідэй устойлівага развіцця. Экадом з'яўляецца адной з найстарэйшых некамерцыйных экалагічных арганізацый у Беларусі. Стварэнне Экадома ініцыявала група энтузіястаў_ак, актывістаў_ак і летуценнікаў_ніц, якія падзялялі прыхільнасць экалагічным прынцыпам і хацелі падзяліцца сваімі ідэямі з іншымі.

## НАША МІСІЯ

Экадом, грунтуючыся на прынцыпах дэмакратыі і ўстойлівага развіцця, разам з аднадумцамі стварае гарманічныя адносіны ўнутры і вакол сябе, у доме, у краіне, у свеце, у сусвеце.

## ШТО МЫ РОБІМ І НАВОШТА

Экадом шукае баланс паміж прыродай і цывілізацыяй. Мы хочам наблізіцца да разумення свету і свайго месца ў ім. У сваёй працы мы актыўна супрацоўнічаем з іншымі грамадскімі экалагічнымі (і не толькі) арганізацыямі, міжнароднымі структурамі, ініцыятывамі і актывістамі_камі.

# КІРУНКІ НАШАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

- ПРАВАВАЯ СЛУЖБА І МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ
- UWEC: ЭКАЛАГІЧНЫЯ НАСТУПСТВЫ ВАЙНЫ ВА УКРАІНЕ
- УСТОЙЛІВАЯ ЭНЕРГЕТЫКА І АНТЫЯДЗЕРНАЯ КАМПАНІЯ
- ЗЯЛЁНАЯ БЕЛАРУСЬ: РАСПРАЦОЎКА “ЗЯЛЁНАГА” БАЧАННЯ БУДУЧЫНІ БЕЛАРУСІ
- ВЫРАШЭННЕ ЭКАЛАГІЧНЫХ ПРАБЛЕМАЎ У БЕЛАРУСІ
- ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ТЭМЫ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

## НАША 26-ГАДОВАЯ ГІСТОРЫЯ

**1991**

- Стварэнне Экадома як экалагічнай ініцыятывы на базе маладзевай рэспубліканскай арганізацыі Next Stop — New Life. У 1996 годзе Экадом зарэгістраваўся як грамадскае аб'яднанне.

**1996**

- Наша каманда правяла першыя ў Беларусі міжнародныя курсы пермакультуры[1].

**2000**

- Адбыўся першы форум экаНДА, ініцыятарам якога быў Экадом.

**2001**

- Пачатак працы над імплементацыяй палажэнняў Орхускай канвенцыі, якую ратыфікавала Беларусь. Орхуская канвенцыя — канвенцыя Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН «Аб доступе да інфармацыі, удзеле грамадскасці ў прыняцці рашэнняў і доступе да правасуддзя па пытаннях, што тычацца навакольнага асяроддзя». Шматгадовая праца Экадома з канвенцыяй дазволіла палепшыць заканадаўства аб удзеле грамадскасці ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў у Беларусі і доступу да экалагічнай інфармацыі, а таксама практыку яго прымянення.

---

[1] Пермакультура — гэта спосаб экалагічнага праектавання, які дапамагае вырошчваць прадукты, будаваць дамы і ствараць супольнасці з мінімальным уздзеяннем на навакольнае асяроддзе.

**2006**

- Пачатак антыядзернай дзейнасці Экадома ў сувязі з будаўніцтвам АЭС у Астраўцы (Гродзенская вобласць). У 2008 годзе мы ініцыявалі стварэнне Беларускай антыядзернай кампаніі (БАЯК). Актывісты_кі ініцыятывы ладзілі абмеркаванні і круглыя сталы з навукоўцамі, праводзілі першую ў Беларусі грамадскую экаэкспертызу;
- ініцыюем стварэнне таварыства экалагічных арганізацый «Зялёная сетка».

**2008**

- Сталі актыўнымі ўдзельнікамі аргкамітэта штогадовага шэсця, прымеркаванага да гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС («Чарнобыльскі шлях»).

**2010**

- Звярнуліся ў суд горада Астравец з патрабаваннем даць інфармацыю для правядзення грамадскай экспертызы Беларускай АЭС. Гэта справа стала першай у развіцці практыкі **судовай абароны экалагічных правоў грамадзян у Беларусі**;
- правялі першую ў Беларусі грамадскую экалагічную экспертызу (праекта будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Рэспубліцы Беларусь).

**2011**

- Пачатак кампаніі па абароне парку імя 40-годдзя Кастрычніка ў цэнтры Мінска, у якой актыўны ўдзел прынялі мясцовыя жыхары, Экадом і «Зялёная сетка». Адміністрацыя горада і забудоўшчык планавалі высечы частку парку і пабудаваць гасцініцу да чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе. Адстаяць дрэвы не ўдалося, пабудаваную гасцініцу назвалі «Пекін». Але кейс стаў рэзанансным і павялічыў цікавасць людзей да праблемы забудовы і высякання зялёных зонаў.

**2014**

- Экадом накіраваў паведамленне пра праслед антыядзерных актывістаў_ак у Камітэт па выкананні Орхускай канвенцыі. Менавіта гэтая справа паклала пачатак стварэнню механізму хуткага рэагавання ў рамках Орхускай канвенцыі ў выпадках пераследу экаактывістаў_ак. Адным з эпізодаў было затрыманне Ірыны Сухій, Таццяны Новікавай і Андрэя Ажароўскага. Яны збіраліся перадаць у амбасаду РФ у Мінску адкрыты зварот супраць падпісання генеральнага кантракту на будаўніцтва АЭС;
- дапамаглі мясцовым жыхарам дамагчыся пераносу аднаго са свінакомплексаў, якія планавалі пабудаваць каля вёскі Мойсічы (за тры кіламетры ад Маладзечна), паказаўшы важнасць удзелу грамадскасці.

**2016**

- Пачатак кансультацый мясцовых жыхароў у Мінску ў ваколіцах сквера Катоўка (раён Сельгаспасёлка). Сквер хацелі часткова высечы і пабудаваць у ім каталіцкі храм. Мясцовыя жыхары і актывісты_кі былі супраць і нават суткамі дзяжурылі ў скверы. У выніку будаўніцтва ўсё ж перанеслі. Гэты гучны і складаны выпадак ярка пазначыў, чаму трэба абмяркоўваць праекты забудовы на ранняй стадыі;
- запуск інфалініі «Зялёны тэлефон» для вырашэння экалагічных праблем. Ідэя службы складалася ў тым, каб даць людзям парады і інструменты для самастойнага вырашэння экапраблем, а не вырашыць сітуацыю за іх.

**2017**

- Стварэнне выставы «Астравец культуры», на якой мастакі_чкі, эколагі_ні і архітэктары_кі прадставілі сваё бачанне далейшага лёсу недабудаванай АЭС у Астраўцы. Мастакі_чкі і эколагі_ні прысвоілі сабе цела Астравецкай АЭС і стварылі магчымасць іншай будучыні.

**2018**

- Наша каманда падрыхтавала сцэнарый энергетычнай [р]эвалюцыі ў Беларусі: пераходу на 100% узнаўляльнай энергіі ў краіне.

**2021**

- Экадому, найстарэйшай экалагічнай арганізацыі Беларусі, споўнілася 25 гадоў;
- грамадскае аб'яднанне «Экадом» ліквідавана рашэннем Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь. Перад ліквідацыяй прайшлі ператрусы ў Ірыны Сухій, сяброўкі Рады арганізацыі, а таксама ў Марыны Дубінай, дырэктаркі Экадома. Міністэрства інфармацыі абмежавала доступ да старога сайту Экадома: ecohome-ngo.by;
- на 7-ай Сустрэчы бакоў Орхускай канвенцыі ліквідацыя Экадома кваліфікаваная як праслед і ўціск экаНДА. Беларусі рэкамендавана аднавіць ГА «Экадом».

**2022**

- Беларусь афіцыйна выйшла з Орхускай канвенцыі;
- Экадом прызналі «экстрэмісцкім фармаваннем»;
- Экадом стаў адным са стваральнікаў міжнароднай ініцыятывы UWEC у адказ на вайну ва Украіне.




# ПРАВАВАЯ СЛУЖБА І МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

## ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА

**Для нас важна, каб кожны чалавек мог рэалізоўваць сваё права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе, меў інструменты для ўдзелу ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў, атрымліваў актуальную інфармацыю пра стан навакольнага асяроддзя і меў магчымасць абараніць свае правы. За час дзейнасці прававой службы мы адпрацавалі больш за 500 кейсаў па ўсёй Беларусі і больш за 60 судовых кейсаў. Акрамя гэтага, мы аналізуем змены ў заканадаўстве па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя, рыхтуем аналітыку пра ўдзел грамадскасці ў прыняцці экалагічных рашэнняў і доступ да інфармацыі.**

### Маніторынг рэпрэсій у экасектары і бэнкватчынг

На працягу года прававая служба праводзіла маніторынг выпадкаў пераследу і ціску ў дачыненні да экаактывістаў_ак і экаНДА, а 21 траўня далучылася да Дня палітвязня ў Беларусі, абвешчанага праваабарончым цэнтрам «Вясна», і неаднаразова расказвала пра палітвязняў-экаактывістаў на сайце Экадома і ў сацыяльных сетках.




Паводле стану на сакавік 2023 года ў зняволенні працягваюць знаходзіцца:

- Віктар Фянчук
- Сцяпан Латыпаў
- Яўген Рубашка
- Андрэй Кузнечык
- Аляксандр Белаў
- Павал Наздра
- Арцём Салавей
- Яўген Меркіс

Але былі і прыемныя навіны: 17 снежня экаактывісты Сяргей Пятрухін і Аляксандр Кабанаў выйшлі на волю, цалкам адбыўшы свае тэрміны.

Паводле дадзеных маніторынгу Lawtrend на аснове адкрытых крыніц, 76 экалагічных арганізацый або НДА, якія маюць экалагічны кампанент дзейнасці, былі ліквідаваны з пачатку 2020 года, 40 экаНДА прынялі рашэнне аб самаліквідацыі.

Акрамя таго, мы паглядзелі, як паўплывалі падзеі пасля жніўня 2020 года ў Беларусі на сітуацыю з фінансаваннем праектаў рознымі банкамі. Так, Сусветны банк сітуацыю ніяк не каментаваў афіцыйна і ніякай пазіцыі ў дачыненні да Беларусі не аб'яўляў, а ЕБРР перастаў інвеставаць у новыя праекты з удзелам дзяржавы з пачатку 2020 года ды не плануе рабіць гэта ў блізкай будучыні. Падрабязнасці ў матэрыяле.

## Выхад з Орхускай канвенцыі

З 1 лютага 2022 года Беларусь была абмежаваная ў асаблівых правах і прывілеях па Орхускай канвенцыі. Такое рашэнне было прынята на 7-й Сустрэчы бакоў Орхускай канвенцыі 21 кастрычніка 2021 г. Яно загадвала Беларусі аднавіць Экадом у рэгістрацыі, але гэтага не адбылося. Факт ліквідацыі быў прызнаны на ўзроўні ЕЭК ААН формай пераследу экаНДА за яе дзейнасць.

12 сакавіка мы атрымалі адказ на наглядную скаргу ад Вярхоўнага суда: у прынясенні пратэсту на рашэнне аб ліквідацыі Экадома нам адмовілі.

Улетку, 23-24 чэрвеня, у Жэневе прайшла пазачарговая Сустрэча бакоў Орхускай канвенцыі, дзе ўпершыню ў гісторыі быў абраны спецдакладчык па пытанні аб абаронцах навакольнага асяроддзя. Ім стаў Мішэль Форст. Гэты механізм быў створаны ў тым ліку і дзякуючы намаганням Экадома. Яго мэта — хуткае рэагаванне ў выпадках пераследу і ціску на экаактывістаў, бо падобныя выпадкі з'яўляюцца істотным парушэннем палажэнняў канвенцыі і патрабуюць неадкладнай рэакцыі, якая ўяўляецца немагчымай, калі справу будуць разглядаць у агульным парадку.

Таксама на Сустрэчы бакоў адбыўся круглы стол, прысвечаны праблеме пераследу экалагічных актывістаў, дзе была прадстаўленая і сітуацыя з экаактывістамі і экаНДА ў Беларусі.

Праз месяц, 18 ліпеня, стала вядома, што Лукашэнка падпісаў указ аб выхадзе Рэспублікі Беларусь з Орхускай канвенцыі. Эксперты ААН па правах чалавека асудзілі гэтае рашэнне. Члены Еўрапейскага ЭКА-Форуму выпусцілі сумесную заяву наконт выхаду Беларусі з Орхускай канвенцыі, у якой назвалі гэтае рашэнне

недаравальным і адзначылі, што працягнуць пільна сачыць за сітуацыяй з рэалізацыяй экалагічных правоў грамадзян_ак Беларусі ды падтрымалі [пазіцыю Экадома](#).

24 кастрычніка Беларусь афіцыйна перастала быць бокам Орхускай канвенцыі.

З гэтай нагоды спецдакладчык Мішэль Форст заявіў:

***«Паколькі сёння апоўначы набывае моц выхад Беларусі з Орхускай канвенцыі, я вельмі шмат думаю пра ўсіх абаронцаў навакольнага асяроддзя, якія ўсё яшчэ знаходзяцца ў небяспецы. Я заклікаю сваіх калег, спецыяльных дакладчыкаў ААН, працягваць надаваць увагу патрэбам абаронцаў навакольнага асяроддзя ў Беларусі. Улічваючы заяўленае абавязацельства выконваць палажэнні Орхускай канвенцыі пасля выхаду з яе, МЗС Беларусі трэба прыняць канкрэтныя меры для забеспячэння эфектыўнага доступу да інфармацыі, удзелу грамадскасці і правасуддзя. Гэта ўключае ў сябе забеспячэнне бяспечных і спрыяльных умоў для абаронцаў навакольнага асяроддзя».***


Michel Forst
@ForstMichel

As #Belarus' withdrawal from the #Aarhus Convention takes effect at midnight tonight, I'm very much thinking of all environmental defenders who are still at risk.I call on my colleagues @un_SPEXPERTS to continue to pay attention to the needs of environmental defenders in Belarus.

11:58 PM · 23 окт. 2022 г.

Michel Forst
@ForstMichel

Given its stated commitment to uphold Aarhus' provisions after withdrawal, @BelarusMFA should take concrete measures to secure effective access to information, public participation and justice. This includes ensuring a safe and enabling environment for environmental defenders.

12:33 AM · 24 окт. 2022 г.

23 лістапада Еўрапейскі парламент у рэзалюцыі аб працягу рэпрэсій супраць дэмакратычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці ў Беларусі [асудзіў выхад Беларусі з Орхускай канвенцыі](#), у прыватнасці ў кантэксце запуску Астравецкай АЭС без поўнага выканання рэкамендацый стрэс-тэсту, і выказаў шкадаванне пра далейшую нядбайнасць адносна выканання самых строгіх правілаў ядзернай бяспекі на пляцоўцы БелАЭС; Еўрапараламент таксама асудзіў жорсткі пераслед беларускім рэжымам абаронцаў навакольнага асяроддзя і правоў чалавека, а таксама НДА, якія ўзнімаюць пытанні ядзернай бяспекі, як Экадом.



## Аналітычная праца

Прававая служба Экадома таксама займалася аналітычнай працай. Мы прынялі ўдзел у падрыхтоўцы **«Грамадзянскага агляду рэалізацыі мэт устойлівага развіцця (МУР) у Беларусі»**, ініцыяванага Офісам Святланы Ціханоўскай і прадстаўнікамі_ніцамі грамадзянскай супольнасці. Эксперты_ткі Экадома падрыхтавалі агляд у рамках часткі МУР 16 (права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе) і МУР 7 (недарагая і чыстая энергія). У аглядах прадстаўлены трэнды з 2016 года.

Марына Дубіна падрыхтавала агляд «Экалагічныя НДА ў 2015-2020 гадах: тэндэнцыі і дасягненні, якія важна захаваць» для зборніка артыкулаў **«Беларуская грамадзянская супольнасць 2015-2021: ад стабільнага развіцця да новых выклікаў»**.

5-7 кастрычніка ў Нікасіі (Рэспубліка Кіпр) завяршыла працу **9-я Міністэрская канферэнцыя «Навакольнае асяроддзе для Еўропы»**. Канферэнцыя сабрала каля 1000 удзельнікаў і ўдзельніц, каля 70 дэлегацый розных краін, прадстаўленых на ўзроўні міністраў_ак, а таксама прадстаўнікоў і прадстаўніц еўрапейскіх і міжнародных арганізацый ды экспертаў і экспертак і НДА. Міністр навакольнага асяроддзя Беларусі на канферэнцыю запрошаны не быў. Затое 6 кастрычніка ў рамках Міністэрскай канферэнцыі на мерапрыемстве аб стратэгічнай экалагічнай ацэнцы (СЭА) у транспартным сектары прадэманстравалі вынікі зробленай Экадомам СЭА па водным шляху Е40.




## Адукацыя, грамадскія абмеркаванні і ўдзел у міжнародных арганізацыях

На працягу года прававая служба адсочвала грамадскія абмеркаванні і расказвала, **як у іх удзельнічаць**. Мы таксама расказалі, што плануецца змяніць у грамадскіх абмеркаваннях горадабудаўнічых і архітэктурных праектаў. Спойлер: стане **прасцей для чыноўнікаў, але складаней для грамадскасці**.

Мы падрыхтавалі цыкл матэрыялаў пра практыкі і аспекты экалагічнага заканадаўства ў адносінах да жывёл: разбіраліся з **абаронай правоў бяздомных жывёл** у Беларусі і тым, ці можна **перадухіліць жорсткае абыходжанне з жывёламі**.

Апроч гэтага, мы паўдзельнічалі ў мностве адукацыйных мерапрыемстваў. Напрыклад, Марына Дубіна і Ірына Сухій выступілі на адукацыйным курсе **Belarus Urban Fellowship — 2022** ад «Цэнтра новых ідэй» з прэзентацыяй «Make belarusian cities green again: як палепшыць экалагічную сітуацыю ў рэгіёнах». Абмяркоўвалі з удзельнікамі_цамі, што можна рабіць у цяперашніх умовах для развіцця беларускіх гарадоў, як захоўваць іх зялёнымі і як уплываць на горадабудаўнічыя рашэнні. А ў межах іншай серыі лекцый расказвалі, як гараджане могуць уплываць на горадабудаўнічую палітыку, каб рабіць беларускія гарады камфортнымі, як працуюць грамадскія абмеркаванні, і якія ёсць паспяховыя прыклады ўдзелу грамадскасці.

Экадом таксама з'яўляецца ўдзельнікам Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, а Ірына Сухій зараз сустаршыня кіраўнічага камітэта

Форума. На канферэнцыі Форума, якая праходзіла ў Празе 5-6 снежня 2022 года, на панэлі, прысвечанай экалагічным наступствам вайны ва Украіне, Ірына прэзентавала міжнародную ініцыятыву UWEC. Ірыне гэтак жа выпала ганаровая місія ўручыць адважнай грамадзянскай супольнасці Украіны Прэмію грамадзянскай супольнасці ФГС УП 2022 года.

## Новы статус

17 кастрычніка Экадом рашэннем КДБ быў прызнаны «экстрэмісцкім фармаваннем». Telegram-канал і чат Экадома былі ўнесены ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.



> **Мы не спынілі нашу працу, нягледзячы наператрусы, затрыманні нашых сябраў і палітычна матываваную ліквідацыю арганізацыі ў 2021 годзе. Мы не спынімся і зараз. Шкадуем, што цяпер у Беларусі «прызнанне» заслуг арганізацый грамадзянскай супольнасці адбываецца такім перакручаным чынам, і працягваем працаваць для новай, «зялёнай» Беларусі.**



# УСТОЙЛІВАЯ ЭНЕРГЕТЫКА І АНТЫЯДЗЕРНАЯ КАМПАНІЯ

## ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА

**Асноўная мэта кампаніі — бяз'ядзернае развіццё і пераход да ўстойлівай энергетыкі Беларусі і суседніх з ёю краін. Мы назіраем за будаўніцтвам БелАЭС і вядзём яго незалежную экспертную ацэнку з 2009 года, а таксама інфармуем міжнародную супольнасць пра вядомыя парушэнні.**

У красавіку 2022 года Экадом правёў Чарнобыльскі тыдзень з мноствам мерапрыемстваў, мэта якіх — расказаць пра наступствы аварыі на ЧАЭС, якія нікуды не падзеліся, засяродзіць увагу на новых жахлівых выкліках, якія з'явіліся пасля 24 лютага, і вепанізацыі АЭС, а таксама прапанаваць альтэрнатыву ядзернаму шляху. Большасць івэнтаў праходзілі анлайн, каб даць магчымасць удзельнічаць беларусам_кам (і не толькі), якія былі вымушаныя з'ехаць з краіны. Больш падрабязна пра мерапрыемствы чытай у раздзеле, прасвечаным папулярызацыі тэмы аховы навакольнага асяроддзя.

Але асобна хочацца адзначыць дзве публічныя дыскусіі: **«І зноў Чарнобыль – новыя радыяцыйныя пагрозы і рызыкі. Што рабіць?»**, дзе сярод іншага ўздымалася пытанне асабістай бяспекі пры ядзернай аварыі, а таксама **«Чарнобыль-2022: як гэта адбылося і як павінны змяніцца падыходы да ядзернай бяспекі?»** з замежнымі экспертамі на YouTube-канале Даследчага цэнтра Офіса Святланы Ціханоўскай сумесна з Оксфардскай абсер-

ваторыяй па Беларусі. Ты таксама можаш паглядзець спецыяльны тэматычны стрым да гадавіны аварыі на ЧАЭС, які мы зрабілі сумесна з «Маланка Медыя».

Таксама на Чарнобыльскім шляху ў Вільнюсе была прынятая рэзалюцыя.

*«Урокі Чарнобыля не засвоены, інакш Еўрасаюз не імкнуўся б абвясціць атамную энергію «зялёнай», а Расія не напала б на АЭС ва Украіне, не ўзяла б іх персанал у закладнікі і не пагражала б свету новым Чарнобылем на месцы ранейшага»,*

— урывак з рэзалюцыі.

У пачатку траўня была апублікаваная справаздача па ініцыяваным Экадомам праекце «Перадоз» — народным маніторынгу месцаў, забруджаных у выніку аварыі на ЧАЭС. Маніторынг працягваецца і сёння, і ты можаш да яго далучыцца. Мы таксама падрыхтавалі кароткі гайд па дазіметрах, якія самі выкарыстоўваем у працы над «Перадозам».

Акрамя гэтага, мы ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы анлайн-дыскусіі «Выклік газазабеспячэнню Германіі ва ўмовах вайны ва Украіне» з міжнароднымі партнёрамі ў чэрвені. У час дыскусіі абмяркоўвалі, як эфектыўна дыверсіфікаваць пастаўкі, якія рэальныя тэрміны паэтапнай адмовы ад расійскага газу на еўрапейскім рынку, а таксама як паскорыць энергетычны пераход і дэкарбанізацыю для ўмацавання энергетычнай бяспекі як Украіны, так і ЕС.

У кастрычніку, заўважыўшы петыцыю з патрабаваннем утылізаваць ядзерныя адходы не ў Беларусі, а ў іншых краінах, якая з'явілася паралельна з арганізаванымі МНС абмеркаваннямі праекта пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні стратэгіі абыходжання з радыеактыўнымі адходамі», расказалі, хто адказны за захоўванне адпрацаванага паліва з БелАЭС. Спойлер: згодна з міжнароднымі пагадненнямі, радыеактыўныя адходы павінны заставацца ў той жа краіне, дзе былі выраблены.

***— Мы бачым відавочны знак, што беларускія грамадзяне і грамадзянкі не давяраюць запэўненням урада наконт бяспекі будучых сховішчаў, і тут Экадом з імі салідарны,***

— кажа прадстаўніца Экадома і актывістка Беларускай антыядзернай кампаніі (БАЯК) Ірына Сухій.

***— Тое, наколькі бяспечным будзе сховішча нашых радыеактыўных адходаў, за якія мы павінны ўзяць на сябе адказнасць, залежыць ад таго, пры якім рэжыме яно будзе пабудавана і эксплуатавацца.***



# ВЫРАШЭННЕ ЭКАЛАГІЧНЫХ ПРАБЛЕМ У БЕЛАРУСІ

## ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА

**Экадом дапамагае людзям самастойна вырашаць мясцовыя экалагічныя праблемы дзякуючы бясплатным кансультацыям з алгарытмамі дзеянняў, шаблонамі зваротаў у дзяржаўныя органы ды іншай экспертнай падтрымцы**

**За 2022 год да нас звярнуліся 150 разоў.**

**МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ:**

Мінск і Мінская вобласць:
**90** зваротаў;

Гродна і вобласць:
**1** зварот;

Брэст і вобласць:
**15** зварот;

Гомель і вобласць:
**7** зваротаў;

Магілёў і вобласць:
**5** зваротаў;

Віцебск і вобласць:
**8** зваротаў;

невядомае месцазнаходжанне:
**20** обращений;

Расія:
**2** звароты;

Літва:
**2** звароты.

**ТЭМЫ:**

зялёныя насаджэнні:
**66** зваротаў;

заканадаўства / справаздачы аб уздзеянні на навакольнае асяроддзе / грамадскія абмеркаванні / грамадска-экалагічныя экспертызы / асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі / гарадское планаванне:
**16** зваротаў;

добраўпарадкаванне:
**4** звароты;

забруджванне паветра:
**5** зваротаў;

запыты інфармацыі:
**20** зваротаў;

адходы:
**19** зваротаў;

жывёлы / птушкі:
**9** зваротаў;

вада / водныя аб’екты:
**8** зваротаў;

шум:
**3** звароты.

**ПОЛ:**



жаночы: **110** зваротаў;

мужчынскі: **38** зваротаў;

невядомы: **2** звароты.

За год мы дадалі на сайт Экадома [**8 новых алгарытмаў**] па вырашэнні экапраблем. Сярод іх два алгарытмы, якія тлумачаць, што рабіць, калі ты выявіў_ла ўзгаранне сухой расліннасці (палы) і калі ты бачыш, што нехта спальвае сухую расліннасць. Два непасрэдна на тэму вогнішчаў: правілы раскладання вогнішчаў у лясах і што рабіць, калі ты бачыш, што нехта распальвае вогнішча ў забароненым месцы і/ці парушае патрабаванні пажарнай бяспекі. Яшчэ два алгарытмы расказваюць, як правільна нарыхтоўваць сокі дрэваў увесну і што рабіць, калі ты стаў_ла сведкам парушэнняў гэтых правіл. Таксама сайт узбагаціўся алгарытмам па неабходных захадах, калі суседзі выкідваюць свае мяшкі з бытавым смеццем у маленькую сметніцу ля пад’езда, і адказам на пытанне, што рабіць з ялінкамі ў кадках пасля сканчэння навагодніх святаў.

Любы ахвотны можа атрымаць неабходны алгарытм дзеянняў, вывучыўшы спецыяльны раздзел нашага сайта. Тамсама можна спампаваць і ўсе шаблоны зваротаў і запытаў.

> **Экадом паспрыяў таму, каб медыя расказалі беларусам і беларускам пра наступныя экапраблемы:**

- **Ці можа жывёламагільнік атруціць ваду ў Віцебскім раёне?**

Паводле **інфармацыі** Экадома, на тэрыторыі прадпрыемства «БелВітуніфарм» (Віцебская вобласць) праектуецца цэх па выпуску вакцыны ад COVID-19. Мы пачыталі справаздачу аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе (АУНА) і занепакоіліся, што жывёламагільнік, з якім мяжуе тэрыторыя вытворчай пляцоўкі па стварэнні новага цэха распрацоўкі вакцыны, можа негатыўна паўплываць на мясцовыя водныя рэсурсы. У парушэнне экалагічных і санітарна-гігіенічных нормаў жывёламагільнік размешчаны ў водаахоўнай зоне возера Доўжа і ў зоне санітарнай аховы падземнай крыніцы пітнога водазабеспячэння (артэзіянская свідравіна). Гэтая свідравіна служыць для водазабеспячэння ўсяго населенага пункта Доўжа і самога «БелВітуніфарм». Пасля ўвагі незалежных СМІ да праблемы і зваротаў Экадома чыноўнікі паабяцалі правесці праверку.

- **У Гомелі збіраюцца пабудаваць Усходні абход горада для разгрузкі транспартнага руху.**

Вывучыўшы справаздачу аб АУНА для будаўніцтва, Экадом **заўважыў**, што ў

лесе ўздоўж Чарнігаўскай трасы ёсць месцы масавых пахаванняў салдат, якія баранілі Гомель у 1941 годзе, а таксама дзве брацкія магілы ахвяр сталінскіх рэпрэсій 1937 года. У дадатковым лісце ад БелНДІПградабудаўніцтва было рэкамендавана пракласці трасу ў іншым месцы, у абыход месцаў пахавання. Аднак пазней чыноўнікі сказалі, што гэта памылка, а на СМІ, якія распаўсюдзілі гэтую інфармацыю, распачалі крымінальныя справы за нібыта «рэабілітацыю нацызму». Пасля публікацый у СМІ справаздачу аб АУНА выдалілі з сайта мясцовага Упраўлення камунальнага будаўніцтва. Аднак утойванне гэтай інфармацыі — парушэнне закона, роўна як і магчымае размяшчэнне новай, «падпраўленай» справаздачы. Экадом заклікаў мясцовых жыхароў_ак звяртацца ў пракуратуру.

- **Асфальтабетонны завод у Брэсце: што з ім не так?**

Па вул. Газдзецкага ў Брэсце **збіраюцца** пабудаваць асфальтабетонны завод. Мы падрыхтавалі і даслалі чыноўнікам 21 заўвагу і прапанову паводле справаздачы аб АУНА. Пасля аналізу дадзеных разліку рассейвання можна зрабіць выснову, што без унясення змен у праектную дакументацыю ў частцы зніжэння ўзроўню выкіду забруджвальных рэчываў завод проста не можа быць пабудаваны на разгляданай тэрыторыі.





# UWEC: ЭКАЛАГІЧНЫЯ НАСТУПСТВЫ ВАЙНЫ ВА УКРАІНЕ

## ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА

24 лютага Расія пачала поўнамаштабнае ўварванне ва Украіну. Пасля гэтага Экадом далучыўся да **маніфеста антываеннага руху** ў Беларусі, а таксама падпісаў **адкрыты ліст экасупольнасці** аб спыненні вайны, **заяву Кіраўнічага камітэта Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства** аб уварванні расійскіх узброеных сіл ва Украіну і **заяву беларусаў** супраць удзелу ў вайне з Украінай. Таксама Экадом і прадстаўнікі_цы Беларускай антыядзернай кампаніі (БАЯК) сярод іншых экалагічных і праваабарончых актывістаў_ак **звярнуліся ў ААН**, патрабуючы правесці экстраную сесію Генасамблеі па Украіне:

> *«Мы настойліва заклікаем вас вынесці на Генеральную Асамблею і эфектыўна вырашыць пытанне абароны жыхароў Украіны ад прымянення зброі масавага паражэння, у тым ліку з дапамогай сродкаў паветранага нападу і канкрэтна — пытанне абароны ўкраінскіх АЭС ад удараў з паветра»,*
>
> — сказана ў заяве.

Дзеля даследавання ўплыву ваенных дзеянняў на навакольнае асяроддзе **паўстала міжнародная ініцыятыва UWEC**, адным са стваральнікаў якой быў Экадом.

UWEC расшыфроўваецца як Ukraine War Environmental Consequences Work Group. Гэта працоўная група па наступствах вайны ва Украіне для навакольнага асяроддзя, у якой прадстаўлена і незалежная беларуская экспертыза. З'яўляючыся згуртаваннем эколагаў_інь, журналістаў_ак, экспертаў_ак і актывістаў_ак, група мае за мэту абмен праверанай інфармацыяй і сумесны пошук рашэнняў узніклых падчас вайны экалагічных праблем.

Камандзе UWEC важна не дапусціць паслаблення законаў і рэгулявання ў сферы аховы навакольнага асяроддзя ў ваенны час, бо шматгадовыя наступствы гэтага будуць трагічнымі. Галоўны фокус працы – пашырэнне інфармацыі на англамоўную аўдыторыю. Матэрыялы на **сайце** выходзяць па-ўкраінску і па-руску. Група таксама рупіцца аб тым, каб пасля перамогі Украіна была адноўленая ў адпаведнасці з «зялёнымі» стандартамі ўстойлівага развіцця.

> ***«Наша праца складаецца з трох крокаў: маніторынг сітуацыі і збор дадзеных, іх верыфікацыя і правядзенне незалежнага экспертнага аналізу ды распаўсюд праверанай інфармацыі пра лакальныя і глабальныя наступствы вайны»,***
>
> — тлумачыць Ірына Сухій.





# ЗЯЛЁНАЯ БЕЛАРУСЬ: РАСПРАЦОЎКА «ЗЯЛЁНАГА» БАЧАННЯ БУДУЧЫНІ БЕЛАРУСІ

## ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА

**У 2022 годзе Экадом разам з іншымі экалагічнымі арганізацыямі, ініцыятывамі і эксперт_камі пачалі распрацоўку бачання Зялёнай Беларусі.**

Экстрэмальная змена клімату, няроўнасць, войны, расізм, беднata, голад, вычарпанне прыродных рэсурсаў, забруджванне навакольнага асяроддзя, праблемы энергетычнай бяспекі, рост аўтарытарных тэндэнцый, крызіс дэмакратыі, дэмаграфічны і экалагічны крызіс – усе гэтыя праблемы стаяць перад чалавецтвам, не звяртаючы ўвагі на дзяржаўныя межы.

Зараз няма краіны, якая пераадолела ўсе гэтыя праблемы аднаасобна, ці якая аказалася б убаку ад іх і не адчувала бы іх уплыў: гэта проста немагчыма. Але мы бачым, што гэтыя праблемы можна пераадолець прынцыпова, а больш справядлівы свет магчымы. Свет, пабудаваны на прынцыпах экалагічнай мудрасці, сацыяльнай справядлівасці, дэмакратыі ўдзелу, ненасілля, устойлівасці і павагі да разнастайнасці.

**Экадом і нашыя калегі_жанкі ўпэўненыя ў магчымасці пабудаваць Зялёную Беларусь як частку агульнага свету, заснаванага на наступных прынцыпах:**

- кліматычная нейтральнасць;
- рэсурсаэфектыўнасць;
- цыркулярнасць;
- справядлівасць;
- устойлівасць;
- сяброўства з навакольным асяроддзем;
- добрае кіраванне.

Сектары працы Зялёнай Беларусі на сёння ўключаюць энергетыку, прамысловасць, транспарт, сельскую гаспадарку, адходы і папярэджванне іх узнікнення, біяразнастайнасць і кіраванне прыроднымі тэрыторыямі, развіццё тэрыторый гарадоў і вёсак, а таксама адукацыю і ўзмацненне чалавечага і чалавечнага патэнцыялу беларусаў ды беларусак.

***«Ахоўваемыя тэрыторыі займаюць значную частку тэрыторыі краіны і ахопліваюць усе ўнікальныя экасістэмы, што забяспечвае захаванне біяразнастайнасці. Пры гэтым яны даступныя для адпачынку і экалагічнага турызму, што дазваляе такім тэрыторыям ставіцца месцамі эканамічнага і культурнага развіцця. Выкарыстанне тэрыторый для вядзення гаспадарчай дзейнасці скіравана на ўстойлівасць і мінімізацыю ўплыву на натуральныя працэсы»,***

— урывак з апісання «зялёнага» бачання.

Распрацоўка «зялёнага» бачання працягваецца, а неўзабаве ў 2023 годзе плануецца абмеркаванне бачання з іншымі зацікаўленымі бакамі.





# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ТЭМЫ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

## ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА

**Для нас важна зразумела і цікава расказваць, над якімі тэмамі мы працуем, а таксама заахвочваць агульную цікавасць да экалагічных выклікаў. Мы хочам, каб як мага больш беларусаў_ак усведамлялі сваю адказнасць за агульную будучыню і разумелі, што спрыяльнае навакольнае асяроддзе — гэта права чалавека, якое важна ўмець рэалізоўваць. Для гэтага мы актыўна вядзем нашыя сацыяльныя сеткі, рыхтуем матэрыялы для сайта, сацсетак і СМІ, ладзім калабарацыі з суполкамі ды інфлюэнсерамі_камі, а таксама праводзім мерапрыемствы і выкарыстоўваем новыя метады для папулярызацыі экалагічнай тэматыкі.**

### ЗА 2022 ГОД МЫ:

- з размахам правялі Чарнобыльскі тыдзень;
- зладзілі анлайн-выставу ў віртуальнай 3D-прасторы;
- дадалі 159 матэрыялаў на сайт Экадома і апублікавалі шмат пастоў;
- зладзілі больш за 10 калабарацый з суполкамі і інфлюэсерамі_камі;
- актыўна супрацоўнічалі з незалежнымі медыя.

Ініцыяваны Экадомам **Чарнобыльскі тыдзень** у 2022 годзе прайшоў пад знакам вепанізацыі АЭС Украіны. Мерапрыемствы адбыліся не толькі ў Беларусі, але і ў Літве, Польшчы, Грузіі, Германіі, ЗША ды іншых краінах. Да Тыдня Экадом падрыхтаваў флэшмоб сярод пісьменнікаў і пісьменніц з іх рэфлексіяй тэмы «мірнага атама», спартыўны чэлендж, які праанансавалі незалежныя беларускія спартсмены_кі, публічныя дыскусіі на ўзроўні СНД і Еўразвязу пры падтрымцы Даследчага цэнтру Офіса Святланы Ціханоўскай і Оксфардскай абсерваторыі па Беларусі, прамы эфір на адным з найбуйнейшых YouTube-каналаў Беларусі «Маланка Медыя», адмысловы ролік пра ўплыў Чарнобыльскай аварыі на мастацтва ад аўтарскага праекта «Каля культуры», варыянты для ўдзелу беларускіх дыяспар свету ды шмат іншага. Тыдзень завяршыўся Чарнобыльскім шляхам з 200+ удзельнікамі_цамі ў Вільнюсе ды акцыямі ў іншых гарадах свету. СМІ напісалі больш за 95 публікацый пра Чарнобыльскі тыдзень і Экадом.

Таксама да Чарнобыльскага тыдня Экадом разам з куратаркай Ксеніяй Тырсікавай зладзіў **анлайн-выставу** **SUNFLOWER** у незвычайнай 3D-прасторы, якая падчас вайны ва Украіне спалучыла ў сабе экалагічны і антываенны пасылы. Удзел у выставе прынялі два дзясяткі беларускіх мастачак і мастакоў.

За год нашы сацыяльныя сеткі выраслі на 585 падпісчыкаў, нягледзячы на атрыманне Экадомам статусу «экстрэмісцкага фармавання». Толькі за снежань нашыя пасты пабачылі больш за 28 тысяч чалавек! Сайт Экадома за год наведала на 32% больш людзей, чым у 2021 годзе - 21 тысяча карыстальнікаў_ніц! А медыя ўзгадалі нас 395 разоў. Мы вельмі ўдзячныя нашай аўдыторыі і СМІ за давер і цікаўнасць да экатэматыкі.

У верасні 2022 з дапамогай незалежных сацыёлагаў мы правялі сацдаследаванне сярод беларусаў і беларусак унутры Беларусі, каб даведацца пра сучаснае стаўленне да экапраблем, іх разуменне і актуальнасць, крыніцы камунікацыі, а таксама пра гатоўнасць удзелу жыхароў да вырашэння гэтых праблемаў.

**Метадам анлайн-апытання сабраўшы і прааналізаваўшы меркаванні 1066 жыхароў і жыхарак гарадоў Беларусі ва ўзросце 18-64 гадоў мы, сярод іншага, выявілі, што:**



**кожны_ая пяты_ая** з апытаных выказвае моцную цікавасць да інфармацыі па экалагічнай тэматыцы;



**жанчыны** цікавяцца экалагічнымі праблемамі **часцей за мужчын** (58% супраць 42%), а самая зацікаўленая ў экатэматыцы ўзроставая група — 45-54 гадоў;



часцей за ўсё **важнымі** называюць экапраблемы глабальнага характару кшталту змены клімату, а таксама забруджванне навакольнага асяроддзя.

Чаму так? Справа ў невысокім узроўні інфармаванасці наконт праяў глабальных праблем на лакальным узроўні і мясцовых экапраблем. Да прыкладу, каля 40% апытаных не ведаюць рэальны статус будаўніцтва і функцыянавання БелАЭС, хаця радыеактыўнае забруджванне — адна з тэмаў, якія хвалююць беларусаў, згодна з іх жа адказамі. Пры гэтым доля праціўнікаў запуску станцыі складае 45%, што вышэй за ўзровень тых, хто падтрымлівае яе работу.

Гэтыя вынікі дапамогуць нам скарэктаваць бягучую дзейнасць і лепш адпавядаць запытам людзей унутры краіны. Са скарочаным тэкстам сацдаследавання ты можаш **азнаёміцца на нашым сайце**.



# ШТО НАПЕРАДЗЕ?

**Экадом працягвае працу, плануе цікавыя калабарацыі са СМІ і інфлюэнсерамі_камі і шукае новыя фарматы. Мы таксама працуем над новай версіяй сайта, каб зрабіць яго больш зразумелым і зручным для карыстальнікаў_ніц.**

- На пачатку 2023 года прадстаўніца Экадома ўвайшла ў асноўны склад Каардынацыйнай рады Беларусі. Мы верым, што па-сапраўднаму дэмакратычныя змены немагчымыя без уліку экалагічных каштоўнасцяў, і лічым важным прасоўваць экапавестку сярод аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі.
- Ужо зараз мы працуем над праграмай Чарнобыльскага тыдня — 2023 года, акцыямі да дня палітычных зняволеных, працягваем кансультаваць людзей па вырашэнні экалагічных праблем і падтрымліваць увагу медыя, беларускай і міжнароднай супольнасці да абароны экаправоў і экалагічных наступстваў вайны ва Украіне.
- У новым, 2023 годзе мы працягнем працу ў нашых напрамках дзейнасці дзеля дабрабыту беларусаў і беларусак і навакольнага асяроддзя. Мы верым, што неўзабаве вернемся ў прававую дзяржаву, новую Беларусь, дзе каштоўнасць правоў чалавека і экалагічных правоў не пусты гук. Мы будзем рабіць усё магчымае, каб наблізіць гэты момант.

## Даведацца больш пра нашу працу можна на нашым сайце і ў сацыяльных сетках:

ecohome.ngo

ecohome.by@gmail.com